**References**

1. Burdin M.Yu. (2017). *Regulyuvannya zemel`nyx vidnosyn v Ukrayini (druga polovyna XVII – XX st.): istoryko-pravovyj ta instytucijnyj vymiry* [Regulation of land relations in Ukraine (second half of XVII - XX centuries): historical, legal and institutional dimensions]. Avtoref. dys. ... d-ra yuryd. nauk : 12.00.01. Kharkiv, 40. (in Ukrainian)
2. Verstyuk V.F. (1992). *Maxnovshhyna. Selyanskyj povstans`kyj rux na Ukrayini 1918–1921* [Makhnovshchyna. Peasant rebel movement in Ukraine 1918 - 1921]. Kyiv: Nauk. dumka. (in Ukrainian)
3. DAXO. F.R. 202, op.2, spr.31.
4. DAXO. F.R. 202, op.2. spr.18.
5. DAXO. F.R. 202, op.1, spr.9.
6. DAXO. F.R. 202. Op.1, spr.18.
7. DAXO.F.R. 202, op.2, spr.19.
8. DAXO.F.R. 202, op.2, spr.20.
9. DAXO.F.R. 202. op.1, spr.14.
10. DAXO.F.R. 202, op.2, spr.16.
11. DAXO.F.R. 202, op.2, spr.22.
12. Lytvyn V.M., Boriak H.V., Heiets V.M. ta in. (2011). *Ekonomichna istoriya Ukrayiny: Istoryko-ekonomichne doslidzhennya* [Economic History of Ukraine: Historical and Economic Research]. Kyiv: Nika-Centr. Vol. 2. (in Ukrainian)
13. Kornienko P.S. (2015). *Transformaciyi zemel`nyx vidnosyn v ukrayins`komu seli (IX – pochatok XXI st.). Porivnyal`nyj analiz* [Transformations of land relations in the Ukrainian village (IX – beginning of XXI century). Comparative analysis]. Ternopil (in Ukrainian)
14. Maistrenko V.S. (1999). Konfliktni sytuaciyi v xodi provedennya stolypins`koyi agrarnoyi reformy v Xarkivs`kij guberniyi (1906 – 1915 гг.) [Conflict situations during the Stolypin agrarian reform in Kharkiv province (1906 – 1915)]. *Visnyk Xarkivskogo derzhavnogo universytetu. Seriya Istoriya.* № 441. Vyp. 31. Pp. 156–165 (in Ukrainian)
15. Reshodko P.F. (1972). *Selyans`kyj rux u Xarkivs`kij guberniyi (berezen 1917 – sichen 1918 r.)* [Peasant movement in Kharkiv province (March 1917 – January 1918)]. Kharkiv: Vyd-vo un-tu. (in Ukrainian).

**УДК 94(476):331.108**
DOI: https://doi.org/10.17721/2520-2626/2019.24.17

***Ігар Пушкін***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
доцент кафеды гуманітарных дысцыплін,
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання,
дактарант Інстытута гісторыі НАН Беларусі

ORCID: 0000-0003-1845-1515
Email: ihar.pushkin.st@gmail.com

# ВЫТОКІ КАРУПЦЫІ І ЗЛОЎЖЫВАННЯЎ УЛАДАЙ У САВЕЦКІМ МІНУЛЫМ (НА ПРЫКЛАДЗЕ БЕЛАРУСІ)

***Анотація.*** *У статті на прикладі БССР, аналізуються історичні передумови корупції та зловживань владою в сучасному суспільстві. Показані прорахунки і недоліки в кадровій політиці партійно-державного керівництва радянської Білорусі. Стверджується, що провал економічної політики був викликаний низкою об'єктивних і суб'єктивних факторів. У тому числі недосконалістю системи підбору кадрів, ослабленням державної і трудової дисципліни, поширенням пияцтва і алкоголізму, крадіжок державної та суспільної власності. Відзначено, що в 1970-1980-і рр. стабільно не скорочувати, а збільшувалася кількість розтрат і розкрадань, фактів використання службового становища для особистого збагачення, в результаті чого народному господарству завдано великої матеріальної шкоди. Особливістю періоду стало і те, що в СРСР і Білорусі були виявлені факти організованою і корумпованою злочинності. Найбільш гучні справи численні факти хабарництва з боку чиновників житлових відділів райвиконкому Мінська (1970), крадіжки та зловживання у споживчій коорерації БРСР, особливо у м. Орша, де у корупційній схемі були задіяні відповідальні працівники Вітебського облвиконкому та Оршанського райвиконкому, працівники покуратури, працівники АБКСМ (ОБХСС) і ДАІ (1973). Негативні тенденції зловживання владою спотсерігалися й серед партійно керівників, у 1981 році були притягнуті до кримінальної відповідальності 138 керівників. Все це викликало соціальну напруженість у суспільстві, невдоволення населення діяльністю органів влади і управління, міліцією республіки. У підсумку партійно-державне керівництво втратило свій авторитет, що разом з економічними проблемами і розбратом в суспільстві призвело -радяснького керівництва: у Вітебській області за різні зловживання упродовж 1975-1980 рр. було покарано понад 100 до розпаду СРСР. Зроблено висновок, що численні факти приписок і окозамилювання ставлять під сумнів достовірність звітних цифр про виконання планів і програм економічного розвитку БРСР, а сучасні численні конфлікти в країнах, які раніше були в складі СРСР, зароджувалися в радянському минулому.*

***Ключові слова:*** *Білорусь, історичні передумови корупції, підбор кадрів, організована і корумпована злочинність.*

**Ihar Pushkin**
Ph.D. in History, Associate Professor,
Department of Humanitarian Disciplines,
Mogilev State University of Food Technologies, Belarus

# THE ORIGINS OF CORRUPTION AND ABUSE OF POWER IN THE SOVIET PAST (EXAMPLE OF BELARUS)

***Abstract.*** *Using the example of the BSSR the article analyzes the historical background of corruption and abuse of power in modern society. Mistakes and shortcomings in the personnel policy of the party-state leadership of Soviet Belarus are shown. The failure of economic policy is stated to have been caused by a number of objective and subjective factors including imperfection of the personnel selection system, weakening of state and labor discipline, spread of drunkenness and alcoholism, theft of state and public property. It is noted that in the 1970-1980s the number of embezzlement and misappropriations, the facts of using one's official position for personal enrichment did not steadily decline but increased, which resulted in great material damage to the national economy. A feature of that period was the fact that the facts of organized and corrupt crime were revealed in the USSR and Belarus. The most notorious cases: the numeral facts of venality by the officials of housing-departments of the Minsk district executive committee (1970), larcenies and abuses in the consumer cooperation in BSSR, especially in Orsha, where the high-level heads of Vitebsk Regional executive committee and Orsha district executive committee as well as some other authority members were involved into official corruption (1973). The negative tendencies of abuse took place also among Party's and Soviet leaders: in Vitebsk Region during 1975-1980 more than 100 authority members were penalized for different cases of abuse; in 1981 138 heads were brought to responsibility. All these facts caused social tension in the society, disaffection of the population with the activities of the authorities, government and militia of the republic. As a result, the party-state leadership lost its authority, which along with economic problems and contention in society led to the collapse of the USSR. It is concluded that numerous facts of upward distortions and fraud bring into question the reliability of reporting figures on the implementation of plans and programs for the economic development of the BSSR, and numerous modern conflicts in countries that formed the USSR arose in the Soviet past.*

***Keywords:*** *Belarus, historical background of corruption, personnel selection, organized and corrupt crime.*

Сучаснаму грамадству неабходны аб’ектыўны аналіз, **з пункту гледжання гістарычнага вопыту,** кадравай палітыкі дзяржаўнай улады, шляхоў фарміравання, зместу і ўдасканалення кадравага патэнцыялу. Сёняшнія шматлікія канфлікты ў краінах, якія раней былі ў складзе СССР, маюць вытокі ў савецкім мінулым і маюць непасрэднае дачыненне да сістэмы падрыхтоўкі і падбору кіруючых кадраў. Наша мэта прааналізаваць гістарычныя перадумовы карупцыі і злоўжыванняў уладаю на прыкладзе БССР у апошнія дзесяцігоддзі яе існавання (1970–1991).

Існаванне жорсткага парадку размеркавання кадраў у СССР прыводзіла да таго, што толькі сяброўства ў КПСС адкрывала дарогу спецыялісту для кар’ернага росту. У савецкі час падбор кадраў ажыццяўляўся на аснове так званых “аб’ектывак” і “гутарак” па інстанцыі (ад інспектара да начальніка аддзялення, упраўлення, намесніка міністра, міністра і г.д.). У кандыдата, найперш, вызначалася такая якасць, як адданасць, вернасць справе партыі, а, па сутнасці, таму, хто запрашаў на службу. Прафесіяналізм таксама быў патрэбен, але ён не быў на першым месцы [2, с. 70].

Роля і значэнне КПСС у справе падрыхтоўкі, фарміравання і кіраванні кадрамі ў 1970–1980-х гг. раскрыты ў шэрагу публікацый савецкіх даследчыкаў. Галоўным у іх было тое, што задачы, якія ставіліся перад кадравым складам былі падпарадкаваны не законам развіцця эканомікі, а фарміраванню новага сацыялістычнага ладу пад кіраўніцтвам КПСС [3; 15; 21; 32]. Склад партыйна-савецкага кіраўніцтва і яго роля ў развіцці эканомікі, сістэма падрыхтоўкі кадраў СССР і БССР у пэўныя гістарычныя перыяды закрануты ў працах, якія з’явіліся ў апошнія дзесяцігоддзі [5; 6; 12; 13; 34]. У сваіх публікацыях даследчыкі не ў поўным аб’ёме асвятлілі пралікі і недахопы ў кадравай палітыцы партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва савецкай Беларусі, у прыватнасці праявы карупцыі і злоўжыванняў уладаю.

Правал эканамічнай палітыкі ў 1970–1980-я гг. быў выкліканы шэрагам аб’ектыўных і суб’ектыўных фактараў, у тым ліку недасканаласцю сістэмы падбору кадраў, іх закасцянеласцю, паслабленнем дзяржаўнай і працоўнай дысцыпліны, распаўсюджваннем п’янства і алкагалізму, крадзяжоў дзяржаўнай і грамадскай уласнасці. Асаблівасцю перыяду стала і тое, што ў СССР і Беларусі былі выяўлены факты арганізаванай і карумпаванай злачыннасці, якія атрымалі шырокі грамадскі рэзананс. Найбольш гучныя справы: шматлікія факты хабарніцтва сярод кіруючых работнікаў Краснадарскага краю (1982), у гандлёвай арганізацыі “Гастраном” Галоўнага ўпраўлення гандлю Масгарвыканкама (1983), у Дзяржаўным камітэце СССР па эканамічных сувязях, Міністэрстве знешняга гандлю СССР пры заключэнні здзелак з замежнымі фірмамі (1986), злоўжыванні і парушэнні законнасці ў органах унутраных спраў Іркуцкай вобласці (1986) і іншыя [8, арк. 1; 4, арк. 1; 9, арк. 1; 11, арк. 1–4]. У БССР гэта так званыя “мінская” і “аршанская” справы, у якія былі ўцягнуты як гаспадарнікі, так і партыйныя, савецкія работнікі, а таксама супрацоўнікі праваахоўнай сістэмы [2, с. 71].

У пачатку 1970 г. у БССР грамадства было ўзрушана выяўленымі шматлікімі фактамі хабарніцтва з боку чыноўнікаў жыллёвых аддзелаў райвыканкамаў Мінска. 04.01.1973 г. Вярхоўны суд БССР разгледзеў справу аб групе злачынцаў на чале з былым старшынёй Аршанскай райспажыўкааперацыі М. Барадой, якая займалася крадзяжом народнага дабра ў асабліва буйных памерах. Варта ўзгадаць, што напрыканцы 1960-х гг. у СССР самай

паспяховай была прызнана работа менавіта ім узначальваемага райспажыўсаюза. На момант свайго арышту Мацвей Барада – выдатнік савецкага гандлю, уладальнік ганаровай граматы Вярхоўнага Савета СССР, будучы Герой Сацыялістычнай працы (былі падрыхтаваны дакументы на прадстаўленне яго да гэтага звання). Як было ўстаноўлена следствам, удзельнікамі групы раскрадальнікаў і іх саўдзельнікамі за перыяд злачыннай дзейнасці было выкрадзена дзяржаўных і грамадскіх сродкаў на суму 806 685 руб. 72 кап. Усяго ж у выніку крадзяжоў і злоўжыванняў абвінавачаныя нанеслі матэрыяльную шкоду на суму 824 423 руб. 99 кап. Амаль на мільён савецкіх рублёў!

Злачынцамі быў створаны “Фонд Барады” – вялікая колькасць дэфіцытных рэчаў і прадуктаў харчавання: андатравых (футравых) шапак, экспартнай гарэлкі, ікры, каўбасы, воблы. Прадукты былі прызначаныя для “патрэбных людзей” – чыноўнікаў з Віцебскага аблвыканкама і Аршанскага райвыканкама, супрацоўнікаў пракуратуры, работнікаў АБКСМ (ОБХСС) і ДАІ. Усяго ў крымінальнай справе названа больш за 20 уплывовых асоб вобласці і нават Мінска, якія на працягу доўгага часу атрымлівалі грашовыя сумы і бясплатныя прадуктовыя “наборы” за лабіраванне інтарэсаў Аршанскага райспажыўсаюза. Кошт падарункаў, якія былі, па падліках следства, “бясплатна раздадзеныя службовым асобам”, ацанілі ў 32 496 рублёў 60 кап. Па словах жа саміх падсудных, “прыкрыццё”, якое на працягу многіх гадоў аказвалі “злачыннай групе” пракуроры, міліцыя і кіраўніцтва выканаўчых камітэтаў Віцебскай вобласці, абыйшлося значна даражэй. У рамках расследавання па “справе Барады” паказанні далі ўсе, каму абвінавачаныя дарылі падарункі. У якасці сведак значыліся старшыня камітэта па кінематаграфіі Савета міністраў БССР, намеснікі старшынь Віцебскага аблвыканкама, старшыня Аршанскага райвыканкама, першы сакратар гаркама партыі Оршы, пракурор Віцебска і інш. Як склаўся іх далейшы лёс: першы сакратар Аршанскага райкама партыі (адзіны, хто спрабаваў абараніць Бараду) стаў дырэктарам прафесійна-тэхнічнага вучылішча, пракурор Віцебска (у яго дома знайшлі бочку салёных агуркоў, якую ў якасці падарунка прывезлі нарыхтоўшчыкі райспажыўсаюза) быў адпраўлены кіраваць дробнай прафсаюзнай арганізацыяй, адзін з кіраўнікоў сярэдняга рангу, не чакаючы прад'яўлення абвінавачвання ў атрыманні хабараў, павесіўся [1].

Аналіз пратаколаў пасяджэнняў абласных партыйных канферэнцый, пленумаў, бюро і сакратарыятаў Віцебскага, Магілёўскага і Гомельскага абласных камітэтаў (АК) КПБ (КПСС) дазволіў выявіць негатыўныя аспекты ў змесце і фарміраванні кадравага патэнцыялу БССР у 1970–1980-я гг. Кіраўнікі, каб атрымаць прэміі і славу станавіліся на шлях ашуканства і падману дзяржавы, завышаючы паказчыкі выканання планавых заданняў. Прычым гэта не адзінкавыя факты. Прыпіскі, ашуканства, крадзеж дзяржаўных сродкаў мелі месца на прадпрыемствах транспарту, гандлю і побыту, у будаўнічых арганізацыях, калгасах і саўгасах, прамысловых прадпрыемствах.

Асабліва шмат было буйных крадзяжоў і злоўжыванняў у спажывецкай кааперацыі БССР. За 1969–1972 гг. было зарэгістравана 343 выпадкі буйных растрат і крадзяжоў тавара-матэрыяльных каштоўнасцяў на суму 465,5 тысяч рублёў. Толькі ў 1971 г. ў Магілёўскай вобласці ў ходзе фінансава-гаспадарчых рэвізій і крымінальных следстваў выяўлена 178 розных адказных асоб, якія ўдзельнічалі ў крадзяжы дзяржаўнай і грамадскай уласнасці. За дапушчаныя злоўжыванні было прыцягнута да адказнасці 146 работнікаў спажыўкааперацыі. У першай палове 1972 г. было знята з пасадаў 14 кіруючых работнікаў, у тым ліку старшыня райспажыўсаюза [27, арк. 194–195]. Наогул у 1970–1972 гг. за незабеспячэнне даручанага ўчастка работы, дапушчаныя злоўжыванні і іншыя недахопы ў працы было вызвалена ад займаных пасадаў 6 старшыняў праўленняў райспажыўсаюзаў, 10 намеснікаў старшыняў праўленняў па гандлі і 12 па кадрах, 12 дырэктараў аптовых баз, 12 дырэктараў райнарыхкантор, 11 галоўных бухгалтараў і 547 матэрыяльна-адказных работнікаў [25, арк. 3].

У Чашніцкім раёне Віцебскай вобласці буйныя растраты і нястачы ў райспажыўсаюзе ўзраслі з 5,4 тыс. руб. (1971) да 23,4 тыс. руб. (1973) ці больш чым у 4 разы; у Новалукомльскім гаркаапгандлі адпаведна з 6,1 тыс. руб да 15,8 тыс. руб ці больш чым у 2,5 разы. Былы кіраўнік гаркаапгандлем (член КПСС) прысвойваў кааператыўныя грашовыя сродкі, браў са склада харчовыя прадукты і не плаціў за іх. Набыў для ўласнага ўжытку легкавы аўтамабіль, які раней належыў гаркаапгандлю і быў прызначаны для продажу “ў сувязі са скарачэннем выдаткаў на ўтрыманне аўтатранспарта” [22, арк. 24–26].

Становішча год ад году не паляпшалася. 22.07.1987 г. каардынацыйны савет па ўпарадкаванні праверак і павышэнню эфектыўнасці кантролю БССР разгледзіў пытанне “Аб працы Белкаапсаюза па ўдасканаленні кантроля за станам ўліку і справаздачнасці на падведамасных прадпрыемствах і арганізацыях, недапушчэнні прыпісак і ашуканства” і зафіксаваў, што ў Белкаапсаюзе не памяншылася колькасць прыпісак і фактаў ашуканства [24, арк. 213].

У першай палове 1970-х гг. калектыўнымі крадзяжамі дзяржаўных сродкаў шляхам складання фіктыўных працоўных пагадненняў і іншых махінацый займаліся ў вытворчым аб'яднанні “Бабруйск-сельмаш”. У ліку ініцыятараў былі намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання, начальнікі планавага і вытворчага аддзелаў, выконваючы абавязкі галоўнага бухгалтара (усе члены КПСС). За два гады імі было скрадзена каля трох тысяч рублёў [14, арк. 44]. На Бабруйскім малочным заводзе было выкрадзена каштоўнасцяў больш чым на 100 тысяч рублёў. Доўгі час у будаўнічым упраўленні № 58

трэста "Лаўсанбуд" (Магілёў) дзейнічала група раскрадальнікаў. Яна займалася крадзяжом будаўнічых матэрыялаў, якія затым прадаваліся прыватным асобам, а атрыманыя грошы прысвойваліся. Адным з актыўных удзельнікаў групы раскрадальнікаў з'яўляўся сам начальнік гэтага ўпраўлення [27, арк. 183, 200]. Ту т і далей усе кіраўнікі – члены КПСС.

Былі факты прыпісак і адпаведна незаконных выплат прэмій на Магілёўскім мясакамбінаце і ліфтабудаўнічым заводзе. Прычым на апошнім ў справаздачах аб выкананні бягучых планаў за 1971 г. і 1978 г. (дырэктар быў той жа). Нягледзячы на гэта, завод рэгулярна значыўся на абласной Дошцы гонару [23, арк. 43–44; 18, арк. 68–75]. Кіраўніцтва завода на працягу 2-х год (1977–1978) уключала ў выкананне плана рэалізацыі не адгружаную прадукцыю. За гэта не законна выплацілі 120 тыс. рублёў прэмій: амаль тысячу атрымаў дырэктар завода, а сакратар партыйнага камітэта завода – 1103 руб. [31, арк. 57]. Прыпіскі да дзяржаўнага плана здабычы нафты ў 1972 г. нафтаздабываючым упраўленнем "Рэчыцанафта" аб'яднання "Беларуснафта", на думку пракуратуры БССР, былі арганізаваны начальнікам аб'яднання "Беларуснафта", а выканаўцамі сталі начальнік і галоўны інжынер "Рэчыцанафта". У выніку прыпісак незаконна былі выплачаны рабочым і служачым "Беларуснафта" 184 311 руб. прэмій, у тым ліку адказным работнікам аб'яднання "Беларуснафта" і "Рэчыцанафта" 11 700 руб. Усе вінаватыя кіраўнікі (дарэчы раней за працоўныя заслугі былі ўзнагароджаны дзяржаўнымі ордэнамі) былі амніставаны ў сувязі з 50-годдзем утварэння СССР [16, арк. 18–20].

У кастрычніку 1974 г. за хабар, спекуляцыю і злоўжыванне службовым становішчам быў арыштаваны і ў ліпені 1975 г. асуджаны на 6 год пазбаўлення волі дырэктар аб'яднання па продажу мэблі Гомельскага гарпрамгандлю (яго кар'ера – інструктар Гомельскага ГК КПБ, намеснік дырэктара па кадрах Гомельскага гарпрамгандлю, загадчык аддзела гандлю Гомельскага гарвыканкама, дырэктар гандлёвай фірмы па продажу швейных тавараў, дырэктар аб'яднання по продажу мэблі Гомельскага гарпрамгандлю). Ён меў сяброўскія сувязі з першым сакратаром Гомельскага ГК КПБ. Нягледзячы на тое, што была ўзбуджана крымінальная справа, дырэктара рэкамендавалі і выбралі дэпутатам гарадскога савета. Яму ўжо пасля прысуду пашырылі жыллёвую плошчу, выдзелілі новую кватэру [ 33, арк. 132–134].

У 1983 г. былі выяўлены: наяўнасць прыпісак пры перавозкі грузаў у Калінкавіцкім мясакамбінаце, Калінкавіцкім філіяле Гомельскай масласырбазы, ПМК 18 трэста "Мазырсельбуд", Калінкавіцкім рознічным пладовагародніным прадпрыемстве, ПМК 111, будаўнічым упраўленні № 185 будтрэста № 27 [19, арк. 13]; парушэнні дзяржаўнай і фінансавай дысцыпліны дырэкцыяй Беларускага металургічнага завода (1984) і іншыя [17, арк. 101–103].

У першай палове 1984 г. праверылі 13 прадпрыемстваў Гомельскага вытворчага аб'яднання малочнай прамысловасці. Вынікі: выяўлены недахоп гатовай прадукцыі – Веткаўскі, Камарынскі, Нараўлянскі, Лельчыцкі маслазаводы, Гомельскі малочны камбінат (малако, вяршкі, тварог, сыраватка і інш.); на Лельчыцкім заводзе чатыры камеры з шынамі і кузаў для аўтамашыны "Масквіч", што належылі заводу, былі пастаўлены на асабісты аўтамабіль дырэктара завода; зафіксавана вялікая колькасць дробных крадзяжоў прадукцыі (160 выпадкаў) на Гомельскім малочным камбінаце, Добрушскім заводзе сухога абязтлушчанага малака, Калінкавіцкім заводзе замяніцеля цэльнага малака, Мазырскім гармалзаводзе, Светлагорскім сыраробным заводзе [20, арк. 193–195].

З 124 прадпрыемстваў і арганізацый, якія былі правераны ў 1987 г. кантрольна-рэвізійным упраўленнем (КРУ) Мінфіна БССР, прыпіскі і скажэнні справаздачнасці выявілі на 68 (54,8%). На 46 прадпрыемствах і арганізацыях (37,1%) былі факты незаконнай выплаты прэмій [24, арк. 214].

Не было належнага патрабавання і высокай прынцыповасці пры адзнацы дзейнасці партыйных, савецкіх і гаспадарчых кіраўнікоў. Часта замена кіруючых работнікаў уяўляла простую механічную перастаноўку кадраў, што не давала жаданага выніку.

Дырэктар Магілёўскага камбіната будаўнічых матэрыялаў з мэтай атрымання прэмій і іншага матэрыяльнага ўзнагароджання займаўся прыпіскамі і ашуканствам. Ленінскі райкам партыі прыцягнуў яго да партыйнай адказнасці, абласное ўпраўленне мясцовай прамысловасці вызваліла яго ад працы "па ўласным жаданні". Але ўпраўленне бытавога абслугоўвання тут жа прызначыла яго дырэктарам Магілёўскага аб'яднання па хімчыстцы і лазнева-пральнаму абслугоўванню. У трэсце "Магілёўсельбуд" у свой час за прыпіскі, крадзеж будаўнічых матэрыялаў і іншыя злоўжыванні быў зняты з працы начальнік ПМК-58. Вельмі хутка ён быў прызначаны начальнікам вытворчага аддзела, а потым і галоўным інжынерам ПМК-44 [27, арк. 181, 185–186, 195, 202]. Намеснік начальніка ўпраўлення мяцовай прамысловасці Віцебскай вобласці быў вызвалены ад пасады за злоўжыванне службовым становішчам, але адразу быў прызначаны дырэктарам хімзавода. Затым намеснікам генеральнага дырэктара ВА "Хімпласт", у пачатку 1972 г. Чыгуначным РК КПБ г. Віцебска быў рэкамендаваны на пасаду дырэктара завода жалезабетонных вырабаў трэста "Віцебскаблсельбуд" [29, арк. 14–15]. Доўгі час у г. Магілёве ставілі ў прыклад, як лепшага кіраўніка, дырэктара завода тэхналагічнага абсталявання або тады яшчэ ложкавага завода. А потым высветлілася, што на заводзе выпускалася няякасная прадукцыя,

квітнела ашуканства, незаконна выдаваліся грашовыя прэміі [27, арк. 181–186].

Усе гэтыя негатыўныя з'явы былі магчымыя таму, што і сярод партыйнага кіраўніцтва назіраліся негатыўныя тэндэнцыі злоўжывання ўладаю. За ганебныя паводзіны і розныя правіны былі вызваленыя ад працы старшыні райвыканкамаў (1970–1971): Краснапольскага, Клічаўскага, Кіраўскага. За праяўленую нясціпласць пры вырашэнні жыллёва-кватэрных пытанняў былі пакараныя ў рознай меры старшыні Касцюковіцкага, Клімавіцкага, Хоцімскага райвыканкамаў. Замест таго, каб наводзіць парадак у раёнах, каб папярэджваць разнастайныя парушэнні, яны самі паказвалі дрэнны прыклад [27, арк. 184, 176–177]. Падобнае інспектарскай групай ЦК КПБ было выяўлена пры неабгрунтаванай замене кватэр адказнымі работнікамі Магілёўскага аблвыканкама і абкама КПБ [26, арк. 55–58].

У Гомельскай вобласці за злоўжыванні (1975) былі вызвалены ад займаемай пасады намеснік старшымі аблвыканкама, старшыня Гомельскага гарвыканкама, намеснік старшыні Гомельскага гарвыканкама, другі сакратар Мазырскага РК КПБ; два адказных работніка аблвыканкама, першы сакратар Гомельскага ГК КПБ атрымалі партыйныя пакаранні і іншыя [30, арк. 55]. У 1979 г. на пасяджэнні бюро Гомельскага АК КПБ у чарговы раз (падобнае было ў 1975, 1977 ) разглядалася пытанне “Аб Запісцы партыйнай камісіі пры ЦК КПБ аб злоўжываннях некаторых кіруючых работнікаў Гомельскай вобласці” [10, арк. 2–7].

За 1971–1975 гг. органамі народнага кантролю за прыпіскі і падман дзяржавы, праявы месцніцтва ў Магілёўскай вобласці былі прыцягнуты да адказнасці 644 пасадавыя асобы [7, арк. 10, 14–15], што складала 4,47% наменклатуры Магілёўскага абкама, гаркамаў і райкамаў КПБ вобласці, у склад якой ўваходзілі 14393 чал. [27, арк. 171]. За 1976–1978 гг. змянілася 47 загадчыкаў аддзелаў і 135 інструктараў гарадскіх і раённых камітэтаў партыі, і толькі 48% з ліку змяніўшыхся работнікаў гаркамаў і райкамаў былі вылучаны на больш адказную працу. Былі вымушаны (менавіта так адзначалася на ХХ Магілёўскай абласной партыйнай канферэнцыі) вызваліць ад займаемых пасад 110 чал. наменклатуры абкама КПБ. За розныя парушэнні статута КПСС на 763 кіруючых работнікаў былі накладзены строгія партыйныя спагнанні. Да крымінальнай адказнасці прыцягнулі 2,5 тыс. раскрадальнікаў народнага дабра, больш 40 тыс. чал. трапілі ў медвыцвярэзнік [31, арк. 41, 57]. У Віцебскай вобласці за 1975–1980 гг. больш 100 кіраўнікоў за розныя злоўжыванні атрымалі спагнанні па лініі КПСС, 27 былі вызвалены ад займаемых пасад. У наступны перыяд сітуацыя ў вобласці толькі пагаршалася. Так, толькі за 1981 г. былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці 138 кіраўнікоў [28, арк. 86].

Такім чынам, аналіз матэрыялаў абласных камітэтаў кампартыі савецкай Беларусі дазваляе выявіць рэальнае становішча ў прамысловасці і стане кадравага патэнцыялу, пралікі і недахопы ў кадравай палітыцы. Варта падкрэсліць, што намі прааналізаваны толькі тыя прыклады, якія не магчыма было схаваць ад грамадскасці. Шматлікія факты па ідэалагічных прычынах замоўчваліся і не даводзіліся да ведама шэраговых партыйцаў.

Неабходна адзначыць, што ў 1970–1980-я гг. прасочвалася тэндэнцыя не да скарачэння, а да павялічэння колькасці растрат і крадзяжоў, ў выніку чаго народнай гаспадарцы наносіўся вялікі матэрыяльны ўрон. За ўвесь час пабудовы сацыялізму і камунізму партыйна-савецкае кіраўніцтва так і не вырашыла, сярод іншых, праблему ашуканства і крадзяжоў у асяродку кіруючых кадраў. У шэрагу гарадоў і раёнаў “не заўважалі” факты прыпісак і падману дзяржавы, памяркоўна адносіліся да тых работнікаў, якія скампраментавалі сябе і ім вельмі часта знаходзілі новыя кіруючыя пасады. Усё гэта выклікала сацыяльную напружанасць у грамадстве, незадавальненне насельніцтва дзейнасцю органаў улады і кіравання, міліцыяй рэспублікі. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва губляла аўтарытэт, што разам з эканамічнымі праблемамі прывяло да распаду СССР.

Шматлікія факты прыпісак і ашуканства ставяць пад сумнеў дакладнасць справаздачных лічбаў аб выкананні планаў і праграм эканамічнага развіцця БССР, а таксама сведчаць, што сучасныя шматлікія канфлікты ў краінах, якія раней былі ў складзе СССР, зараджаліся ў савецкім мінулым.


1. Анкудо, Е. Фонд Бороды; Фонд Бороды – 2. *БелГазета*. 03 февр., 10 февр. URL: http://www.belgazeta.by/ru/2003_02_03/arhiv_bg/5244/ http://www.belgazeta.by/ru/2003_02_10/arhiv_bg/5275/ (Дата доступа 15.04.2019).

2. Барвінок К. І. Кадравая палітыка ў сістэме МУС Беларусі ў 60–80-х гадах ХХ ст. *Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук*. № 4. С. 69–75.

3. Возрастание руководящей роли КПСС в строительстве социализма и коммунизма / редкол.: Родионов П. А. и др. М.: Политиздат. 1979. 296.

4. Выписка из протокола № 131/10с от 23.11.1983 г. заседания Секретариата ЦК КПСС. *Расійскі дзяржаўны архіў навейшай гісторыі (РДАНГ)*. Ф. 89. Воп. 11. Спр. 135.

5. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. *Беларусь у 1946–2009 гг.* / Л. Лыч і інш.; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.). Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. 728.

6.Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2 / М. У. Смяховіч і інш.; рэдкал.: А. А. Каваленя і інш; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск: Беларус. навука, 2012. 654.

7. Доклад “Основные итоги развития народного хозяйства Могилевской области за 1971–1975 годы”.

*Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМаг)*. Ф. 9. Воп. 155. Спр. 2.

8. Записка от 16.03.1982 г. КПК при ЦК КПСС. *РДАНГ*. Ф. 89. Воп. 11. Спр. 134.

9. Записка от 2.01.1986 г. министра внутренних дел СССР В. В. Федорчука "О злоупотреблениях и нарушениях законности в органах внутренних дел Иркутской области". *РДАНГ*. Ф. 89. Воп. 11. Спр. 136.

10. Записка партийной комиссии при ЦК КПБ о злоупотреблениях некоторых руководящих работников Гомельской области. *Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці (ДАГАГом)*. Ф. 144. Воп. 153. Спр. 111.

11. Записка председателя КГБ СССР В. М. Чебрикова в ЦК КПСС (1986). *РДАНГ*. Ф. 89. Воп. 18. Спр. 85.

12. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе / М. П. Касцюк [і інш.]; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]; Нац.акад.навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск: Беларус.навука, 2008. 615.

13. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. / А. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш.; Інстытут гісторыі АНБ. Мінск: Беларусь, 1995. 560.

14. Отчётный доклад Могилёвского обкома КПБ XIX областной партийной конференции (23–24.12.1975). *ДАГАМаг.* Ф. 9. Воп. 155. Спр. 1.

15. Петровичев, Н. А. (1982). Возрастание руководящей роли КПСС и вопросы организационно-политической работы / Н. А. Петровичев. М.: Политиздат. 255 с.

16. Письмо прокуратуры БССР в Гомельский ОК КПБ от 30.08.1974 г. *ДАГАГом.* Ф. 144. Воп. 142. Спр. 36.

17. Письмо Стройбанка и Облфо в Гомельский ОК КПБ от 07.05.1984 г. *Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (ДАГом).* Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 1682.

18. Постановление бюро Могилевского обкома КПБ, исполнительного комитета областного Совета депутатов и президиума областного совета профсоюзов от 29.10.1974 г. *ДАГАМаг.* Ф. 9. Воп. 153. Спр. 40.

19. Постановление Гомельского областного комитета народного контроля (протокол № 5 от 30.05.1984). *ДАГом.* Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 1682.

20. Постановление Гомельского областного комитета народного контроля (протокол № 1 от 25.01.1984). *ДАГом*. Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 1682.

21. Пронин И. И. (1981). Руководящие кадры: подбор, расстановка и воспитание. М.: Мысль. 224.

22. Протокол № 106 заседания бюро Витебского областного комитета КПБ от 28.01.1974 г. *Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц)*. Ф. 1-п. Воп. 130. Спр. 22.

23. Протокол № 11 заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 19.04.1978 г. *ДАГАМаг*. Ф. 9. Воп. 159. Спр. 109.

24. Протокол № 2 координационного совета по упорядочиванию проверок и повышению эффективности контроля от 22.07.1987 г. *ДАГом.* Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 2022.

25. Протокол № 33 заседания бюро Могилевского обкома КПБ от 06.04.1973 г. *ДАГАМаг*. Ф. 9. Воп. 151. Спр. 15.

26. Протокол № 7 заседания секретариата Могилёвского обкома КПБ от 6.05.1975 г. *ДАГАМаг*. Ф. 9. Воп. 155. Спр. 48.

27. Протокол № 8 заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. *ДАГАМаг*. Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3.

28. Протокол VII пленума Витебского областного комитета КПБ. 02.09.1982 г. *ДАВц*. Ф. 1-п. Воп. 154. Спр. 11.

29. Протокол XI пленума Витебского областного комитета КПБ 28–29.11.1972 г. *ДАВц*. Ф. 1-п. Воп. 124. Спр. 8.

30. Протокол XIX Гомельской областной партийной конференции (1975). *ДАГАГом*. Ф. 144. Воп. 144. Спр. 1.

31. Протокол XX Могилевской областной партийной конференции от 26.01.1979 г. *ДАГАМаг*. Ф. 9. Воп. 162. Спр. 2.

32. Разумов Е.З. (1983). Проблемы кадровой политики КПСС / Е. З. Разумов. М.: Политиздат. 192.

33. Справка о фактах неправильного поведения некоторых работников от 15.08.1975 г. *ДАГАГом*. Ф. 144. Воп. 144. Спр. 37.

34. Федоров А. В. (2005). Кадровая политика СССР на завершающем этапе индустриальной модернизации (конец 1950–1980-е гг.): автореферат диссертации на соискание учёной степени к.ист.н.: специальность 07.00.02. Москва. 16.

**References**

1. Ankudo, E. (2003). Fond Borody [Boroda's Fund] Fond Borody–2 [Boroda's Fund – 2]. *Belgazeta*. 03 Febr., 10 Febr. URL: http://www.belgazeta.by/ru/2003_02_03/arhiv_bg/5244/ http://www.belgazeta.by/ru/2003_02_10/arhiv_bg/5275/ (Last accessed 15.04.2019) (In Russian).

2. Barvinok K. I. (2005). *Kadravaja palityka u systeme MUS Belarusi u 60-80 hadakh XX st*. [Personal Policy in the System of MUS in Belarus in 1960-80es.]. *Vestsi NANB. Humanities*. No. 4. P. 69–75. (In Belorussian).

3. *Vozrastanije rukovodiashchej roli KPSS v stroitelstve sotsialisma i kommunizma* [Increasing of the leading role of the KPSU in construction of socialism and communism] / Rodionov P.A. and others (eds.). Moscow: Politizdat. 1979. 296. (In Russian).

4. Vypiska iz protokola No. 131/10c ot 23.11.1983 zasedatija Sekretariata TsK KPSS [Extract from the protocol No. 131/10c of the session of Secretariat of the Central Committee of KPSU from 23.11.1983]. Russian State Archive of Contemporary History *(RSACH)*. Fund 89. Inventory 11. Act. 135. (In Russian).

5. *Historija Belarusi* [History of Belarus] (2011). In 6 Vol. Vol. 6. Belarus in *1946–2009* / L. Lych and others (eds.) M. Kastsiuk (Editor-in-Chef). Minst: Sovremennaja shkola; Ekoperspektiva. 728. (In Belorussian).

6. *Historyja belaruskai dziarzhaunastsi u kantsu 18 – pachatku 21 st.* [History of Byelorussian statehood from the end of 18th – till the beginning 21st centuries]. In 2 Vol. Vol. 2 / M. U. Smiakhovych, A. A. Kavalenia and others (eds.) State academy of sciences of Belarus, Institute of History. Minsk: Belarus. navuka. 2012. 654. (In Belorussian).

7. *Doklad "Osnovnyje itogi razvitija narodnogo khoziajstva Mogilevskoj oblasti za 1971–1975 gody"* [Report "The main results of development of national economy in the Mogilev region in 1971–1975"]. State Archive of public organizations of the Mogilev region (SAPOMog). Fund 9. Invent. 155. Act. 2. (In Russian).

8. *Zapiska ot 16.03.1982 KPK pri TsK KPSS* [Letter of KPK by TsK KPSU from 16.03.1982]. *RSACH*. Fund. 89. Invent. 11. Act. 134. (In Russian).

9. *Zapiska ot* 2.01.1986 ministra vnutrennikh del SSSR V.V. Fedorchuka "O zloupotreblenijakh i narushenijakh zakonnosti v organakh vnutrennikh del Irkutskoi oblasti" [Letter of the Minister of Interior V.V. Fedorchuk from 2.01.1986 "About abuse and violation of legal order in the bodies of Interior in Irkutsk region"]. *RSACH*. Fund 89. Invent. 11. Act. 136. (In Russian).

10. *Zapiska partijnoj komissii pri TsK KPB o zloupotrevlenijakh nekotorykh rukovodiashchikh rabotnikov Gomelskoi oblasti* [Letter of the Party's commission by Central Committee of the Communist Party of Belarus (KPB) about the abuses done by some leading persons in Gomel region]. State archive of public organizations of Gomel Region (SAPOGom). Fund 144. Invent. 153. Act. 111. (In Russian).

11. Zapiska predsedatelia KGB SSSR V.M. Chebrikova v TsK KPSS [Letter of the chairman of KGB of the USSR V.M. Chebrikov to the TsK KPSU] (1986). *RSACH*. Fund 89. Invent. 18. Act. 85. (In Russian).

12. *Narys historiji belaruskaj dzarzhavnasti: 20. stagodze* [Outline of the History of Belarusian statehood in 20th century] / A. A. Kavalenia and others (eds.); State academy of sciences of Belarus, Institute of History. Minsk: Belarus. navuka 2008. 615 p. (In Belorussian).

13. *Narysy historiji Belarusi: in 2 parts.* [Outlines of Belorussian History: in 2 parts] Part 2. / A. P. Kastsiuk, I.M. Ihnatsenka, U.I. Vypyshynski (eds.). Minsk: Belarus. 1995. 560. (In Belorussian).

14. *Otchotnyi doklad Mohilevskoho obkoma KPB XIX oblastnoi partijnoj konferentsii (23–24.12.1975)* [Report of Mogilev Regional committee of the Comunist Party of Belarus for the XIX Regional party conference (23–24.12.1975)]. SAPOMog. Fund 9. Invent. 155. Act. 1. (In Russian).

15. Petrovichev N.A. (1982). *Vozrastanije rukovodiashchej roli KPSS i voprosy organzatsionno-politicheskoj raboty* [Increasing of the leading role of KPSU and the questions of organizational and political work]. Moscow: Politizdat. 255. (In Russian).

16. Pismo prokuratury BSSR v Gomelskij OK KPB ot 30.08.1974 [Letter of the public prosecutor's office of the BSSR to the Gomel Regional committee of the KPB from 30.08.1974]. *SAPOGom.* Fund 144. Invent. 142. Act. 36. (In Russian).

17. *Pismo Stroibanka i Oblfo v Gomelskij OK KPB ot 07.05.1984* [Letter of Stroj-Bank and Oblfo to Gomel Regional committee of the KPB from 07.05.1984]. *State Archive of Gomel Region (SAGom).* Fund 1174. Ivent. 8. Act. 1682. (In Russian).

18. *Postanovlenije Buro Mohilevskoho obkoma KPB, ispolnitelnogo komiteta oblastnogo soveta deputatov i prezidiuma obalsnogo soveta provsojuzov ot 29.10.1974* [Resolution of the Office of Mogilev Regional committee of the BKP, exuecutive commete of the Regional Council of Deputies and of the Presidium of Regional Trade Union's council 29.10.1974]. SAPOMog. Fund 9. Invent. 153. Act. 40. (In Russian).

19. Postanovlenije Gomelskogo oblastnogo komiteta narodnogo kontrolia (Protokol No. 5 ot 30.05.1984) [Resolution of Gomel Regional committee of People's control (Protocol No. 5 from 30.05.1984)]. *SAGom.* Fund. 1174. Invent. 8. Act. 1682. (In Russian).

20. Postanovlenije Gomelskogo oblastnogo komiteta narodnogo kontrolia (Protokol No. 1 ot 25.01.1984) [Resolution of Gomel Regional committee of People's control (Protocol No. 1 from 25.01.1984]. SAGom. Fund 1174. Invent. 8. Act. 1682. (In Russian).

21. Pronin I.I. (1981). *Rukovodiashchije kadry: podbor, rasstanovka i vospitanije* [Executive personal: selection, appointment and training]. Moscow: Mysl. 224. (In Russian).

22. *Protokol No. 106 zasedanija biuro Vitebskogo oblastnogo komiteta KPB ot 28.01.1974* [Protocol No. 106 of administration's session of the of Vitebsk Regional committee of KPB from 28.01.1974]. State Archive of Vitebsk Region (SAVt). Fund 1-p. Invent. 130. Act. 22. (In Russian).

23. *Protokol No. 11 zasedanija plenuma Mogilevskogo obkoma KPB ot 19.04.1978* [Protocol No 11 of the plenary session of Mogilev Ragional committee of KPB from 19.04.1978]. SAMog. Fund 9. Invent. 159. Act. 109. (In Russian).

24. *Protokol No. 2 koordinatsionnoho soveta po uporiadacheniju provererok i povysheniju effektivnosti kontrolia on 22.07.1987* [Protokol No. 2 of Coordinative council for the regulation of checking and increasing of the control effectiveness]. SAGom. Fund 1174. Invent. 8. Act. 2022. (In Russian).

25. *Protokol No. 33 zasedanija Biuro Mogilevskogo obkoma KPB ot 06.04.1973* [Protocol No. 33 of the session of Mogilev Regional committee of KPB from 06.04.1973]. SAPOMog. Fund 9. Invent. 151. Act. 15. (In Russian).

26. *Protokol No. 7 zasedanija sekretariata Mogilevskogo obkoma KPB ot 6.05.1975* [Protokol No. 7 of Secretariat's session of the Mogilev Regional committee of KPB from *6.05.1975*]. SAPOMog. Fund 9. Invent. 155. Act. 48. (In Russian).

27. *Protokol No. 8 zasedanija plenuma Mogilevskogo obkoma KPB ot 04.07.1972* [Protokol No. 8 of the plenary session of Mogilev Regional committee of KPB from 04.07.1972]. SAPOMog. Fund 9. Invent. 149. Act. 3. (In Russian).

28. *Protokol VII plenuma Bitebskogo oblastnogo komiteta KPB 02.09.1982* [Protokol of VII plenum of Vitebsk Regional committee of KPB 02.09.1982]. SAVt. Fund 1-p. Invent. 154. Act. 11. (In Russian).

29. *Protokol XI plenuma Vitebskogo oblastnogo komiteta KPB 28–29.11.1972* [Protocol of XI plenum of Vitebsk Regional committee of KPB 28–29.11.1972]. SAVt. Fund 1-p. Invent. 124. Act. 8. (In Russian).

30. *Protokol XIX Gomelskoj oblastnoj partijnoj konferentsii (1975)* [Protocol of XIX Gomel Regional party's conference (1975)]. SAPOGom. Fund 144. Invent. 144. Act. 1. (In Russian).

31. Protokol XX Mogilevskoj oblastnoj partijnoj konferentsii ot 26.01.1979 [Protocol of XX Mogilev Regional Party's conference from 26.01.1979]. SAPOMog. Fund 9. Invent. 162. Act. 2. (In Russian).

32. Razumov E.Z. (1983). *Problemy kadrovoj politiki KPSS* [Problems of personals' polity of KPSU]. Moscow: Politizdat. 192. (In Russian).

33. Spravka o faktakh nepravilnogo povedenija nekotorykh rabotnikov ot 15.08.1975 [Inquiry about the facts of wrong behavior of some workers from 15.08.1975]. SAPOGom. Fund 144. Invent. 144. Act. 37. (In Russian).

34. Fedorov A.V. (2005). Kadrovaja poliyika SSSR na zavershajushchem etape indurtrialnoj modernisatsii (konets 1950–1980): avtorferat dissertatsii na soiskanije uchenoj stepeni k.ist.n. spetsialnost 07.00.02 [Personal's policy of the USSR on the final stage of industrial modernization (late 1950-1980s): Abstract of Dissertation… of the Ph.D. in History]. Moscow. 16. (In Russian).